## Тлумачальная запіска

**Клас**: 6

**Тэма ўрока:** «Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў»

**Навучальная мэта:** паглыбленне ведаў пра агульныя і ўласныя назоўнікі, азнаямленне з правапісам ўласных назваў.

**Задачы ўрока:**пашырыць веды вучняў пра сталыя марфалагічныя прыметы назоўніка: агульныя, уласныя; садзейнічаць засваенню беларускай граматычнай тэрміналогіі; пазнаёміць з правіламі правапісу ўласных назоўнікаў; узбагаціць веды вучняў па гісторыі Алімпійскіх гульняў, асаблівасці іх правядзення; фарміраваць уменне падзяляць назоўнікі на агульныя і ўласныя з улікам іх семантыкі, знаходзіць назоўнікі названых груп у тэкстах, адрозніваць па асноўных прыметах, ужываць у маўленні; выпрацоўваць навык правапісу ўласных назоўнікаў; стварыць умовы для замацавання навыка самаацэнкі; стварыць выхаваўчую сітуацыю для фарміравання асобы з трывалымі ўяўленнямі пра неабходнасць здаровага ладу жыцця.

**Месца ў сістэме ўрокаў**: другі ўрок па вывучэнні назоўніка як самастойнай часціны мовы.

**Асноўныя метады:** часткова-пошукавы.

**Тып урока**: урок камбінаванай будовы.

**Форма:** урок- марафон.

**Абсталяванне:**Беларуская мова: Вучэбны дапаможнік для 6-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі школы з беларускай і рускай мовамі навучання / В. П. Красней, Я.М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. – Мн.: НІА, 2015.; школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы/ В.І.Верціхоўская, М.І.Верціхоўская-Мн.:УніверсалПрэс, -2006 – 384с.; экран “Нашы поспехі” на дошцы (Дадатак 6); марафонны ліст на кожнага вучня (Дадатак 6); нагляднасць для вывучэння новага матэрыялу (Дадатак 1, 4); практычны матэрыял для кожнага вучня (тэкст для актуалізацыі ведаў, матэрыял для заданняў 2, 3, тэкст для задання 4) ; тры│ розных колераў для рэфлексіі.

**Дэвіз урока:** “Хутчэй. Вышэй. Мацней”.

## ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант (ПРЫВІТАННІ)**

***Настаўнік.***

Дзень добры, любы шосты клас!
Я вельмі рада бачыць вас.
Да ведаў зробім новы крок,
Вас запрашаю на ўрок.

**Псіхалагічны настрой на ўрок***(прыём "Каляровая паперка")*

***Настаўнік.*** Цікава, а з якім настроем вы прыйшлі сёння на ўрок беларускай мовы? Перад вамі ляжаць тры фігуркі (сонейка, зорачка і хмарка), выберыце, калі ласка, сабе адну, якая падыходзіць вам па настроі, і пакажыце ўсім нам.

На ўрок прыйшлі з цудоўным настроем тыя, хто паказаў мне сонейка; у каго хмарка – той чамусьці сумуе; у каго зорачка – той гатовы плённа працаваць на ўроку. (Я прапаную вам пазбавіцца дрэннага настрою. Для гэтага пакладзіце свій дрэнны настрой або нейкія непрыемныя думкі на далонь, павярніцеся да акна і здзьмухніце). Спадзяюся, што зараз у нас на ўроку будзе панаваць толькі цудоўны настрой. Бо нездарма яшчэ старажытныя грэкі казалі: «Добры настрой – гэта ўжо палова перамогі». А яна нам сёння вельмі спатрэбіцца. Я жадаю вам поспеху на нашым занятках, бо яны сёння не зусім звычайныя.

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока:**

***Настаўнік.***Сёння мы з вамі будзем працягваць размову пра самастойную часціну мовы, якая гаворыць аб сабе так:

*Спытай у мяне, хто*
*ці што гэта –*
*і дам я назвы ўсім прадметам.*

***Настаўнік.*** Так, гэта назоўнік. Але перш чым перайсці да тэмы нашага ўрока адкажыце, калі ласка, чаго вы чакаеце ад урока сёння і пра што хацелі б даведацца? *(Адказы вучняў).*

Сёння мы пачнём вывучэнне сталых марфалагічных прымет назоўніка.

**III. Лексічная хвілінка**

***Пытанне вучням***: Якое лексічнае значэнне слова "сталы"? Давайце звернемся да тлумачальнага слоўніка беларускай мовы. (Праца з тлумачальным слоўнікам).

*Адказ*: Сталы 1. Дарослы, самастойны, сур'езны. 2. Пастаянны, нязменны; разлічаны на доўгі тэрмін. 3. Добра абдуманы.

***Пытанне вучням***: Слова мнагазначнае. Якое з вышэй названых значэнняў падыходзіць у дачыненні да назоўніка?

*Адказ:* Другое значэнне. Пастаянны, нязменны; разлічаны на доўгі тэрмін.

***Настаўнік.*** Каб высвятліць, пра якія сталыя марфалагічныя прыметы пойдзе гаворка і выйсці на тэму нашага ўрока, калі ласка, звярніце ўвагу на словы, запісаныя на дошцы (спорт, Беларусь, спаборніцтва, Афіны, марафонцы, Алімпійскія гульні). Што вы заўважылі ў іх напісанні, чым яны адрозніваюцца?

*Адказ:* Адны словы пішуцца з вялікай літары, іншыя - з малой.

***Настаўнік.*** Як называюцца такія назоўнікі?

*Адказ:* Агульныя і ўласныя назоўнікі (Паняцці вывешваюцца на дошцы (Дадатак 1).

***Настаўнік.*** Тэма нашага ўрока так і гучыць: «Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў». А зараз давайце паспрабуем самі сфармуляваць мэты нашага ўрока.

*Адказ:* Навучыцца адрозніваць агульныя і ўласныя назоўнікі, фарміраваць уменне знаходзіць іх у тэкстах, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні, засвоіць асноўныя правілы правапісу ўласных назваў.

***Настаўнік.***Звярніце, калі ласка, увагу на дэвіз нашага ўрока. Дэвіз урока: "Хутчэй. Вышэй. Мацней".

***Пытанне вучням***: Ці вядомы вам гэты дэвіз і дзе вы яго чулі?

*Адказ:* Гэта дэвіз Алімпійскіх гульняў.

***Пытанне вучням***: Што вы ведаеце пра гісторыю Алімпійскіх гульняў?

*Адказ:* Праводзяцца адзін раз у чатыры гады (летнія і зімовыя). Спаборніцтвы паміж спартсменамі ўсіх краін свету ў сіле, хуткасці і спрыце.

***Настаўнік.*** Калі праводзіліся апошнія зімовыя гульні? (у 2018годзе) Калі адбудуцца летнія? (улетку 2020 года) Якая значная спартыўная падзея адбылася ў Мінску ў чэрвені 2019? (Еўрапейскія гульні- спаборніцтвы па 15 відах спорта, дзе прымалі ўдзел спартсмены з пяцідзесяці краін Еўропы. Спаборніцтвы па васьмю відах спорта былі ўключаны ў сістэму летніх Алімпійскіх гульняў 2020 года ў Токіо). (Суразмоўніцтва пра гісторыю Алімпійскіх гульняў суправаджаецца паказам слайдаў).

На ўроку мы паспрабуем даказаць самім сабе, што мы здольныя, таленавітыя, актыўныя, нічым не горшыя за атлетаў-алімпійцаў. А спартыўны дэвіз актуальны не толькі ў спаборніцтвах, але і ў навучанні.

**IV. Актуалізацыя ведаў**

***Настаўнік***. Таму я прапаную вам паўдзельнічаць у марафоне, у які мы ператворым наш урок. Давайце узгадаем, што такое марафон.

*Адказ:* Марафон – 1.Спартыўны бег на 42 км 195 м, а таксама наогул спартыўныя гонкі на самай доўгай дыстанцыі. (Лыжны м.) 2.Пераноснае значэнне: Пра якое-н. спаборніцтва, першынство па чым-н., якое праходзіць вельмі доўга. (Шахматны м.)

***Настаўнік.*** Як вы ўжо зразумелі, сёння нас з вамі чакае невялікае спаборніцтва, у якім вы прадэманструеце свае веды ў галіне мовазнаўства. А каб адчуць сябе сапраўднымі марафонцамі, нам трэба крыху пераўвасобіцца (Вучні апранаюць спартыўныя кепкі і кожнаму з іх прысвойваецца свой уласны нумар, пад якім яны будуць "спаборнічаць").

Зараз вы атрымаеце марафонныя лісты, на якіх мы з вамі сёння будзем працаваць. У атрыманых лістах неабходна пазначыць нумар, імя і прозвішча атлета (сваё ўласнае імя). Звярніце ўвагу на этапы, якія вамі павінны быць пераадолены:

**Успамінаем !!!**

**Вывучаем!!!**

**Замацоўваем!!!**

**Паўтараем!!!**

Вышэй узгаданыя этапы змяшчаюць заданні, якія вам неабходна выканаць. Марафонны ліст і ёсць своеасаблівы "забег" або дастанцыя, якую неабходна пераадолець кожнаму марафонцу. Вынікам праходжання кожнага адрэзка заданняў будзе самаацэнка.Насупраць кожнага задання ёсць круг (або кальцо). Пасля праходжання этапу вы павінны расфарбаваць яго ў адпаведны колер – чырвоны: ёсць цяжкасці, праблемы; жоўты – не зусім усё атрымалася; зялёны – усё атрымалася.

За адказы на ўроку вы будзеце атрымліваць алімпійскія кольцы. Ваша задача: сабраць пяць алімпійскіх кольцаў (сімвал Алімпіяды – пяць пераплеценых кольцаў – увасабленне адзінства пяці кантынентаў) (Дадатак 2). Пераможцы будуць узнагароджаны (медалямі).

**Першы этап: Успамінаем!!!**

***Настаўнік.*** Такім чынам, пачынаем наш марафон. Першы этап – Успамінаем!!!Дарэчы, да якой часціны мовы адносіцца слова марафон?

*Адказ:* Назоўнік.

***Настаўнік.***Дайце азначэнне назоўніка як часціны мовы.

*Адказ:*Назоўнік – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае прадмет і адказвае на пытанні хто? што?

***Настаўнік.*** Азірніцеся вакол і назавіце назоўнікі.

*Адказ:* Вучань, дошка, крэйда, настаўнік і г.д.

***Настаўнік***. Якія граматычныя катэгорыі характэрны назоўніку?

*Адказ:* Назоўнікі адносяцца да аднаго з трох родаў – жаночага, мужчынскага і ніякага, змяняюцца па родах і ліках.

***Настаўнік***. Што мы можам сказаць пра сінтаксічную ролю назоўнікаў?

*Адказ:*Назоўнікі могуць выконваць ролю любога члена сказа (Беларусь – мая Радзіма)

***Настаўнік.***Зараз я раздам вам матэрыял па гісторыі ўзнікнення марафону (Дадатак 3). Давайце зачытаем гэты тэкст.

***Пытанне вучням:*** У пачатковай школе вы ўжо знаёміліся з паняццем "уласны назоўнік". Паспрабуйце адшукаць уласныя назоўнікі ў прапанаваным тэксце і падкрэсліць іх.

*Адказ:* Марафон, Фідзіпід, Афін, Грэцыі, Алімпіяда, Алімпійскіх гульняў, Аўстраліі, Францыі, Спірас Луіс, Афінах.

***Пытанне вучням***: Па якой характэрнай рысе вы пазналі ўласныя назоўнікі?

*Адказ:* Вялікая літара.

***Настаўнік.***А зараз я прапаную вам ацаніць першы этап нашага марафону – Успамінаем!!! (Настаўнік раздае па першаму алімпійскаму кальцу тым вучням, хто беспамылкова пераадолеў першы этап).

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу:**
**Другі этап: Вывучаем!!!**
***Настаўнік.*** Мы пазнаём ўласныя назоўнікі па вялікай літары. Але гэта правіла працуе толькі тады, калі мы бачым надрукаваны тэкст. А што рабіць, калі мы ўспрымаем тэкст на слых? З іншымі сакрэтамі размежавання агульных і ўласных назоўнікаў мы пазнаёмімся сёння. Звярніце ўвагу на малюнкі.
(Настаўнік прапануе вучням два малюнкі, на якіх намаляваны спартсмены). (Дадатак 4)
***Пытанне вучням***: Які назоўнік мы можам ужыць, каб назваць асоб, якія выяўлены на малюнку?
*Адказ*: Спартсменка (Слова вывешваецца на дошцы).
***Пытанне вучням***: Які назоўнік трэба ўжыць, каб вылучыць з гэтай групы індывідуальнасць і адрозніваць аднаго спартсмена ад другога?
*Адказ*: Узгадаць спартсмена імя (Надзея Скардзіна, Дар’я Домрачава). (Словы вывешваецца на дошцы).
***Пытанне вучням***: Суаднясіце названыя назоўнікі з тэарэтычнымі паняццямі “агульны”, “уласны”. Абгрунтуйце свой адказ.
*Адказ вучняў.*
***Пытанне вучням***: Якія яшчэ індывідуальныя назвы, акрамя імёнаў і прозвішчаў, вы ведаеце?
*Адказ:* Назвы геаграфічных аб’ектаў, прадпрыемстваў, газет, часопісаў, марак і гатункаў вырабаў.
***Настаўнік.***А заразазнаёмціся, калі ласка, з тэарэтычным матэрыялам “Агульныя і ўласныя назоўнікі” (Праца з падручнікам, с. 38).
***Настаўнік.*** На аснове прачытанага выканайце настунае заданне. <u>Узнаві ключавое слова (заданне 2)</u>.

Агульныя назоўнікі абазначаюць назвы .............................. прадметаў (аднародных).

Уласныя назоўнікі гэта .................................. назвы прадметаў, з’яў, падзей, паняццяў (індывідуальныя).

Уласныя назоўнікі пішуцца з ............................ літары (вялікай).

Уласныя назоўнікі — гэта імёны, .......................................(прозвішчы людзей, клічкі жывёл, назвы гарадоў, рэк)

(Самаправерка па падручніку).

(Самаацэнка. Атрыманне алімпійскіх калец вучнямі, якія беспамылкова справіліся з заданнем).

**Перапынак у марафоне – хвілінка адпачынку** (Прагляд відэороліка “Дэмінскі лыжны марафон 2019”, дзе прымалі ўдзел 19 краін свету, у тым ліку Беларусь).

**Гульня “Хто хутчэй?”** Настаўнік называе назоўнікі. Калі назоўнік агульны, вучні павінны хлопнуць у далоні, калі ўласны – прыўстаць.

**V. Замацаванне новага матэрыялу:**

**Трэці этап: Замацоўваем!!!**

Заданне 3.Кожнаму слову сваё месца.

***Настаўнік.***Размяркуйце па групах: агульныя – уласныя, прапанаваныя вам словы. Прыгадайце вам вядомыя гістарычныя звесткі, звязаныя з гэтымі словамі.

Словы: *Алімпія, атлет, стадыён, чэмпіён, Надзея Скардзіна, медаль, Грэцыя, Сідней, суддзя, Піфагор.*

***Адказ*:** уласныя: Алімпія, Надзея Скардзіна, Грэцыя, Сідней, Піфагор; агульныя: атлет,чэмпіён, стадыён, медаль, суддзя.
(Праверка па ланцужку).

Падбярыце да запісаных вамі агульных назоўнікаў уласныя, да ўласных – агульныя, выкарыстоўваючы прыгаданыя гістарычныя звесткі.

*Горад* **Алімпіяатлет** *Ціхан*
*Спартсменка* **Скардзіна** **стадыён** *“Дынама”*
*Чэмпіён* **Кушнірмедаль** *“За адвагу”*
*Краіна* **Грэцыя**
*Горад* **Сідней**
*Матэматык* **Піфагор**
(Варыянты адказаў зачытваюцца вучнямі).

(Самаацэнка. Атрыманне алімпійскіх калец вучнямі, якія беспамылкова справіліся з заданнем).

***Пытанне вучням***: Уважліва паглядзіце на словы другога слупка. Ці могуць агульныя назоўнікі пераходзіць ва ўласныя?
*Адказ*: Назва медаля і стадыёна – пераход агульнага назоўніка ва ўласны.

***Слова настаўніка:*** Ёсць яшчэ адна асаблівасць правапісу агульных назоўнікаў – некаторыя з іх бяруцца ў двукоссе. Так павінна быць напісана назва стадыёна і медаля ў вашым заданні. Якія яшчэ групы назоўнікаў падпарадкоўваюцца гэтаму правілу, падкажа ваш падручнік(Праца з падручнікам, с. 39).

Заданне 4.Выберы правільны варыянт.

***Настаўнік.*** Пастаўце, дзе гэта неабходна, двукоссе, выберыце малую ці вялікую літару для напісання.

Цукеркі (С) спорт, (В) востраў (Р) радос, (А) атлеты з (С) сірыі, (А) александрыі, (В) вавілона, (Л) лідэр, (Ф) футбол, (Ч) часопіс (З) здаровы лад жыцця, (С) спартсменка (Д) дар’я (Д) домрачава, (Т) трэнер, (В) верш (О) ода спорту, (Ч) чэмпіён (Ш) штангіст.

***Адказ:*** Цукеркі “Спорт”, востраў Радос, атлеты з Сірыі, Александрыі, Вавілона, лідэр, футбол, часопіс “Здаровы лад жыцця”, спартсменка Дар’я Домрачава, трэнер, верш “Ода спорту”, чэмпіён штангіст.

(Узаемаправерка па ўзоры. Самаацэнка. Атрыманне алімпійскіх калец вучнямі, якія беспамылкова справіліся з заданнем).

Заданне 5.Знаёмыя незнаёмцы.

***Настаўнік.***Вамнеабходнапрачытаць тэкст, узнавіць прапушчаныя словы, захоўваючы правілы правапісу агульных і ўласных назоўнікаў. Паставіць, дзе неабходна двукоссе.

***Тэкст:***

У святочныя дні грэкі праводзілі спартыўныя спаборніцтвы – гульні. Найбольш вядомымі былі гульні ў ........................ , размешчанай у маляўнічай даліне вострава .................................... . Гэты горад быў свяшчэнным месцам для грэкаў. У ім знаходзіўся велічны .................. , у якім стаяла велізарная статуя ....................... , створаная ........................ . У гонар гэтага бога і праводзіліся спаборніцтвы адзін раз у чатыры гады.

На Алімпійскіх гульнях самыя дужыя грэчаскія ........................... спаборнічалі ў .................................................................................................... .

Пад час гульняў у ..................... спыняліся войны. Дзесяткі тысяч людзей ехалі ў Алімпію. Прычым не толькі спартсмены, але і пісьменнікі і паэты. Герадот упершыню чытаў уголас свой твор ........................... , скульптар Паліклет стварыў, услаўляючы алімпійцаў, статую ........................... , Мірон – ...................... , паэты чыталі ................. ў гонар гульняў, аратары спаборнічалі ў майстэрстве ................................ .

Алімпійскія гульні выхоўвалі людзей, умацоўвалі духоўныя і фізічныя сілы народа. “Здаровы дух у здаровым целе,” – гаварылі грэкі, калі хацелі сказаць аб прыгажосці чалавека.

***Даведка***: (А) алімпія; (П) пелапанес; (Х) храм; (З) зеўс; (Ф) фідый; (А) атлеты; (С) скачкі, (Б) барацьба, (К) кіданне дыска; (Г) грэцыя; (Т) твор (Г) гісторыя; (С) статуя (К) кап’яносец; (С)статуя (Д) дыскабол; (В) вершы; (К) красамоўства.

***Адказ:***

У святочныя дні грэкі праводзілі спартыўныя спаборніцтвы – гульні. Найбольш вядомымі былі гульні ў Алімпіі, размешчанай у маляўнічай даліне вострава Пелапанес. Гэты горад быў свяшчэнным месцам для грэкаў. У ім знаходзіўся велічны храм, у якім стаяла велізарная статуя Зеўса, створаная Фідыем. У гонар гэтага бога і праводзіліся спаборніцтвы адзін раз у чатыры гады.

На Алімпійскіх гульнях самыя дужыя грэчаскія атлеты спаборнічалі ў скачках, барацьбе, кіданні дыска.

Пад час гульняў у Грэцыі спыняліся войны. Дзесяткі тысяч людзей ехалі ў Алімпію. Прычым не толькі спартсмены, але і пісьменнікі і паэты. Герадот упершыню чытаў уголас свой твор “Гісторыя”, скульптар Паліклет стварыў, услаўляючы алімпійцаў, статую “Кап’яносец”, Мірон – “Дыскабол”, паэты чыталі вершы ў гонар гульняў, аратары спаборнічалі ў майстэрстве красамоўства.

Алімпійскія гульні выхоўвалі людзей, умацоўвалі духоўныя і фізічныя сілы народа. “Здаровы дух у здаровым целе,” – гаварылі грэкі, калі хацелі сказаць аб прыгажосці чалавека.

(Самаацэнка. Атрыманне алімпійскіх калец вучнямі, якія беспамылкова справіліся з заданнем).

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**Чацвёрты этап: Паўтараем!!!**

***Пытанні вучням***: З якімі тэарэтычнымі паняццямі вы пазнаёміліся на ўроку? Што новага пра іх даведаліся? Чаму яшчэ з глыбокай старажытнасці людзі займаліся спортам? Якое яго значэнне ў жыцці сучаснага чалавека?

***Слова настаўніка***: Старажытныя грэкі высока цанілі гульні і наогул спорт. Прычым не толькі за тое, што ён робіць чалавека здаровым і моцным, але і за тое, што ўзвышае і надае высакароднасць душы. Яны раней ўсіх зразумелі, што нельга быць чалавекам культурным, калі лянуешся займацца фізічнай культурай хаця б для сябе. Вось чаму пра чалавека некультурнага старажытныя эліны гаварылі: “Не ўмее ні чытаць, ні плаваць”.

Сёння мы з вамі правялі незвычайны ўрок – урок-марафон, на якім паспрабавалі даказаць самім сабе, што мы здольныя, таленавітыя, актыўныя, нічым не горшыя за атлетаў-алімпійцаў. А спартыўны дэвіз актуальны не толькі ў спаборніцтвах, але і ў навучанні. І кожны з вас ведае, што можа пасправаць свае здольнасці па вучэбных прадметах на школьных, раённых і абласных алімпіядах.

**VII. Рэфлексія.**

Вучні падлічваюць колькасць колераў. Колер, які пераважае, і ёсць вынік марафоннага забегу. Кожны прымацоўвае свой колер на экран “Нашы поспехі” (Змешчаны на дошцы). Вучні, якія сабралі поўную эмблему Алімпійскіх гульняў, атрымліваюць узнагароду – залаты медаль (10-9 балаў), якія сабралі чатыры кальцы – срэбны медаль (8-7 балаў), тры – бронзавы медаль (6-5 балаў), два – драўляны медаль (4 балы). Настаўнік запытвае вучняў, ці спраўдзіліся іх чаканні ад ўроку.

**VIII. Дамашняе заданне:** §10

“7-8” – пр.59

“6-5” – пр.56

“4” – пр.55

**Дадатак 1**

# Агульныя назоўнікі

# Уласныя назоўнікі

**Дадатак 2**

**Гісторыя ўзнікнення марафону**

У 490 годзе да н.э. пасля бітвы ля горада Марафона старажытнагрэцкі воін Фідзіпід (дакладна не вядома) прабег ад месца бітвы да Афін, каб расказаць пра перамогу. Пасля адной фразы ён памёр. Дакладна не вядома, ці было гэта падзея на самай справе ці не, бо дакументальныя крыніцы адсутнічаюць.



**ПЕРШЫ Ў СВЕЦЕ МАРАФОН**

У Грэцыі ў 1896 году адбылася першая ў свеце Алімпіяда. У праграме Алімпійскіх гульняў быў марафон. Да забегу удзельнікаў было 17. Напярэдадні спаборніцтваў з-за спёкі некалькі спартоўцаў адмовіліся бегчы. У выніку жорсткай барацьбы паміж спартоўцамі з Аўстраліі, Францыі і Грэцыі, перамогу атрымаў грэк Спірас Луіс, які здолеў пераадолець свой першы і адзіны марафон. Дыстанцыя яго складала 40 кіламетраў. Ён здолеў прабегчы гэтую адлегласць за 2 ч 58 м і 50 сек.

Спірас Луіс стаў нацыянальным героем. У яго гонар названы стадыён у Афінах.Адлегласць забегу некалькі разоў змянялася.Ужо пасля, у 1921 годзе, было зацверджана канчатковае адлегласць. Яно склала 42 км 195 м і засталося нязменным па гэты дзень.

**Адказы:** Марафон, Фідзіпід, Афін, Грэцыі, Алімпіяда, Алімпійскіх гульняў, Аўстраліі, Францыі, Спірас Луіс, Афінах

**Дадатак 3**



**Дадатак 4**



**Агульны назоўнік(спартсменка), уласны назоўнік (Дар’я Домрачава)**




**Агульны назоўнік(спартсменка), уласны назоўнік (Надзея Скардзіна)**

**Дадатак 5**

**МАРАФОННЫ ЛІСТ**

**Імя і прозвішча атлета**_________________________________

**Старт**

**Першы этап: Успамінаем!!!**

*Заданне 1.Паспрабуйце адшукаць ўласныя назоўнікі ў прапанаваным тэксце “Гісторыя ўзнікнення марафону”і падкрэсліць іх. Пасля праверкі запішыце словам колькасць правільна вызначаных уласных назоўнікаў.*

_______________________________________________

_______________________________________________

Самаацэнка

**Другі этап: Вывучаем!!!**

*Заданне 2.Узнаві ключавое слова.*

Агульныя назоўнікі абазначаюць назвы .............................. прадметаў.

Уласныя назоўнікі гэта ................................. назвы прадметаў, з’яў, падзей, паняццяў.

Уласныя назоўнікі пішуцца з ............................ літары.

Уласныя назоўнікі — гэта імёны, ......................................

(Самаправерка па падручніку)

Самаацэнка

*Заданне 3. Кожнаму слову сваё месца.*

Размяркуйце па групах: агульныя – уласныя, прапанаваныя вам словы. Прыгадайце вам вядомыя гістарычныя звесткі, звязаныя з гэтымі словамі.

***Словы:*** *Алімпія, атлет, стадыён, чэмпіён, Надзея Скардзіна, медаль, Грэцыя, Сідней, суддзя, Піфагор.*

| *Агульныя назоўнікі* | *Уласныя назоўнікі* |
| --- | --- |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

Самаацэнка

*Заданне 4. Выберы правільны варыянт.*Пастаўце, дзе гэта неабходна, двукоссе, выберыце малую ці вялікую літару для напісання.

Цукеркі (С) спорт, (В) востраў (Р) радос, (А) атлеты з (С) сірыі, (А) александрыі, (В) вавілона, (Л) лідэр, (Ф) футбол, (Ч) часопіс (З) здаровы лад жыцця, (С) спартсменка (Д) дар'я (Д) домрачава,  (Т) трэнер, (В) верш (О) ода спорту, (Ч) чэмпіён (Ш) штангіст.

Самаацэнка

**Трэці этап: Замацоўваем!!!**

<u>*Заданне 5.Знаёмыя незнаёмцы*</u>. Прачытаць тэкст, узнавіць прапушчаныя словы, захоўваючы правілы правапісу агульных і ўласных назоўнікаў. Паставіць, дзе неабходна двукоссе.

***<u>Тэкст:</u>***

У святочныя дні грэкі праводзілі спартыўныя спаборніцтвы – гульні. Найбольш вядомымі былі гульні ў ......................... , размешчанай у маляўнічай даліне вострава ................................... . Гэты горад быў свяшчэнным месцам для грэкаў. У ім знаходзіўся велічны .................. , у якім стаяла велізарная статуя ....................... , створаная ....................... . У гонар гэтага бога і праводзіліся спаборніцтвы адзін раз у чатыры гады.

На Алімпійскіх гульнях самыя дужыя грэчаскія ............................ спаборнічалі ў ........................................................................................................ .

Пад час гульняў у ..................... спыняліся войны. Дзесяткі тысяч людзей ехалі ў Алімпію. Прычым не толькі спартсмены, але і пісьменнікі і паэты. Герадот упершыню чытаў уголас свой твор ............................ , скульптар Паліклет стварыў, услаўляючы алімпійцаў, статую ........................... , Мірон – ...................... , паэты чыталі ................. ў гонар гульняў, аратары спаборнічалі ў майстэрстве ................................ .

Алімпійскія гульні выхоўвалі людзей, умацоўвалі духоўныя і фізічныя сілы народа. "Здаровы дух у здаровым целе," – гаварылі грэкі, калі хацелі сказаць аб прыгажосці чалавека.

***<u>Даведка</u>***: (А) алімпія; (П) пелапанес; (Х) храм; (З) зеўс; (Ф) фідый; (А) атлеты; (С) скачкі, (Б) барацьба, (К) кіданне дыска; (Г) грэцыя; (Т) твор (Г) гісторыя; (С) статуя (К) кап'яносец; (С)статуя (Д) дыскабол; (В) вершы; (К) красамоўства.

Самаацэнка

**Чацвёрты этап: Паўтараем!!!**

Самаацэнка

**Фініш**

**Мая адзнака сабе за працу на ўроку:** __________

**Дадатак 6**

**Нашы поспехі**

| № п/п | Прозвішча і імя вучня | Колер, які пераважае у марафонным лісце | Колькасць набраных алімпійскіх кольцаў |
|---|---|---|---|
| 1 | | | |
| 2 | | | |
| 3 | | | |
| 4 | | | |
| 5 | | | |
| 6 | | | |